Цэна асобнага нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: **Вільня, Віленская вул., № 29.**

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес.—2 р. 3 мес.—1 р. Перамена адрэсу—20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцыю, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам с фаміліей,, хто ня захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакцыі. Рэдакцыя пак дае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год IX. 12 Сьнежня 1914 г. № 49

**Каб не было задзержкі у высылцэ газэты, просім прысылаць патпіску на 1915 г.**

## Прыймаецца патпіска на 1915 год на беларускую газэту

## „НАША НІВА“

**ГОД ВЫДАВЕЦТВА X.**

«НАША НІВА» як і тые гады будзе працаваць над адраджэньнем Беларусі, шырыць беларускую сьведомасць, бараніць інтэрэсоў гаротнага беларускага народу.

«НАША НІВА» у публіцыстычным аддзелі друкуе стацьці на палітычные, экономічные і національные тэмы, лепшых беларускіх публіцыстоў; у бэлетрыстычным аддзелі дае апаведаньні, сцэнічные творы і вершы, лепшых бэлетрыстоў і паэтоў. Апрача гэтаго дае многа вестак з жыцьця на Беларусі і з усіх старон. У вясковым жыцьці «НАША НІВА» заменяе сабой штодзенную часопісь.

Цэна «НАШАЙ НІВЫ» на год с перасылкай—2 р. 50 кап.; на поўгода—1 руб. 25 кап; на 3 месяцы—65 к.; на 1 м. 25 к.

Усе гадавые і поўгадавые падпісчыкі атрымаюць дарма **„Беларускі Календар“**, які заслужыў ужо некалькі нарадаў на краёвых выстаўках.

*Пробные нумэры высылаюцца дарма.*

**Усе, каму дорага справа адраджэньня беларусоў да культурна-національнага жыцьця, выпісывайця, чытайця і шырця „НАШУ НІВУ“.**

Адрэс рэдакцыі: **Вільня, Віленская 29.**

Рэдактар-Выдавец **І. Луцэвіч.**

*Усім, хто перад Новым Годам захочэ абзнаеміцца з „Нашай Нівай“, калі прышле свой адрэс, то кантора Рэдакціі будзе высылаць газэту да Новаго Году ДАРМА.*

## Без гарэлкі.

Дагэтуль людзі ў нас кожную бяду, кожнае горэ залівалі гарэлкай. Яны ня думалі аб тым, ак зжыць гэтую бяду,—а толькі стараліся затуманіць свае вочы, каб яе ня бачыць.

З гэтаго беда расла, шырылася і паношылася па нашых вёсках і сёлах, па мястэчках і гарадох. Гарэлка аслабляла фізычные і духоўные сілы чэлавека, рабіла яго нядзольным да змаганьня з усімі бедамі.

Чым далей шырылося п'янства, чым мацней яно спутывало волю і розум людзей, тым слабейшымі ставаліся яны, і ўселякіе хваробы ды сьмерць пустошылі старану. З году ў год рабілася ўсё горш і горш, ажно 1912 год паказаў страшэнны абраз жыцьця нашаго.

Упраўленьне глаўнаго лекарскаго інспэктара надрукавало атчот за 1912 год аб санітарным палажэньні Расейскай дзержавы. Выходзіць, што прырост народу з году ў год зменшаецца, і ў 1912 г. паменшаў проці сярэдняго прыросту за апошніе дзесяць лет па 25 душ на кожные 10,000 (радзілося 430 душ на 10,000 населеньня). За тоеж узрос лік уселякіх заразных хвароб. Страшэнна шырацца сухоты. Гэтак у 1902 гаду на кожные 10,000 душ народу хворых на сухоты было 397 душ. А вось у 1912 г.—ужо 698! Усяго па ўсей дзержаве сухотнікоў было ў 1912—1,145,410 душ! З гэтаго на горад прыходзіцца 42 прац. на вёску—58 прац. Агулам жэ ад усіх востра-заразных хвароб у Расеі памірае у два разы болей народу, чым ва ўсіх іншых дзержавах Эўропы.

Ведама, не адна гарэлка тутака вінавата: ёсьць многа — дужа многа іншых прычын гэтаго... Але, прыгледаючыся да узросту ў нас п'янства і хвароб, бачым, што узрост іх ідзе бадай—што роўна.

Цяпер настаў канец п'янству,—і скажэм: у самую пару. Можна сьмела сказаць, што гэты год будзе куды ласкавейшы на нас, чым мінуўшые, што лік хвароб, у аснове каторых ляжала гарэлка, зменшыцца значна. Скасаваньне гарэлкі ўжо зусім выразна адбілося на некаторых бакох жыцьця народнаго.

Ведаем добра, што ад п'янства ў нас па вёсках бываюць бяз ліку пажары. Той п'яны закінуў, дзе ня трэба, агонь з люлькі. Гэны газьнічку абярнуў, ці серніка кінуў, не затушыўшы. Дый ці мала ведаем здарэньнеў гэткаго гатунку? Вось жэ, ўжо за першые месяцы забароны таргоўлі гарэлкай выявілася тая праўда, што лік пажароў зменшаецца неспадзевана.

Возьмем прыклад с Казанскай губэрні. Як налічыла тамтэйшая земская управа, ад 1909 да 1913 г.г. сярэднім лікам бывала ў Казанскай губэрні па 82 пажары у жніўні месяцы і 85 — у верэсьні. А сёлета, як гарэлкі ні стала, у жнўні было па 20 пажароў, у верэсьні—53. Дый апошняя цыфра была-бы шмат меншая, каб не ўнадзіліся людзі піць «політуроўку», дэнатурованы спірт (што можна толькі паліць, а ня піць) і інш.

Гэты прыклад дужа паважны: ён пdescribed — 

---

# ВАЙНА.

**На Усходнім фронце**, каторы ўжо тыдзень ідуць напраўдзі крывавые змаганьня расейскаго войска з немцамі і аўстрыякамі.

Як ведаем, у канцы лістападу на **Млаўскім** напрамку немцы адыйшлі к сваей граніцы. 7 сьнежня паведамлялося, што праціўнік ужо на сваей зямлі атступіў на фронт Ляутэнбург—Нэйдэнбург, а 9 сьнежня Штаб апавешчае, што на Млаўскім напрамку пярэдніе часьці немцоў мецілісяізноў перайці расейскую граніцу. Гэтак—на правым беразе Віслы (на поўнач ад Варшавы).

Найболей заўзятае змаганьне ідзе на левым беразе Віслы (на паўдня-захад ад Варшавы), у раёне ўпадаючых у Віслу рэчэк Бзуры, Равкі, Піліцы, на такіх болей-меней напрамках: **Сохачов—Скерневіцы — Томашов — Опочно** (гэта апошняе якраз на захад ад Радома). Атакі немцоў на гэтых напрамках ідуць вельмі заўзятые. Два разы мецеліся яны пераходзіць р. Бзуру і адзін раз Віслу каля Добжына (трохі на захад ад Плоцка), але расейцы, з немалымі стратамі для праціўніка, усе гэтые пробы пераходу адбілі. Бітвы у гэтым раёне ішлі болей-меней так: з раніцы 1 сьнежня паміж Ловічам і Віслай, на левым беразе Бзуры, завязаліся вельмі заўзятые сустрэчные бітвы, пасьля каторых расейцы некалькі пасунуліся наперад. 2 сьнежня неадступные атакі немцоў не спыняліся, у агульным іх напрамку ад Кернозя на Сохачов, цэлы дзень. Расейскае войска, змушэнае адбіваць атакі на недагоднай для себя мейсцовасьці, к вечару троху адыйшло назад. 4 лістапада у звязку з атбыўшымся пераходам часьці расейскаго войска к р. Бзуры і неспыняўшымся узмацаваньням аўстрыякоў на Карпатах, прышлося стасоўна да гэтаго зьмяніць размешчэньне некаторых нашых армій. 5 сьнежня пачынаюць развівацца бітвы на Бзуры. Расейскае войска адбіла некалькі нямецкіх атак. 6 сьнежня, на фронце па рэках Бзуры і Равкі ішло некалькі бітвоў, якіе ў некаторых пунктах былі вельмі заўзятые. Адбываліся бітвы такжэ у раёне Опочно. 8 сьнежня найболей заўзятая бітва ішла у раёне леваго берагу р. Піліцы. Агулам, у гэтым раёне (на левым беразе Віслы) усе атакі немцоў былі адбіты з вялікімі для іх стратамі, і толькі на некаторых участках расейцы атступілі некалькі на ўсход, каб заняць болей выгадные пазыціі. 9 сьнежня немцы найболей напіралі у напрамку проці Скерневіц і іншых не падалёк ад Скерневіц участках, каб перэбрацца цераз Бзуру і Равку, але усюды былі аткінуты расейскімі проці-атакамі за гэтые рэчкі, на свае ранейшые пазыціі, пры чым мелі вялікіе страты. На Левым беразі Піліцы так сама ішла заўзятая бітва у 10-ці верстах на захад ад Новэ-Място. На правым беразі гэтай рэчкі расейцы пасунуліся на перад у раёне Опочно—Томашов.

У **Галіччыне** гэты тыдзень расейцам лепей шанцавало: наступаньне аўстрыякоў з-за Карпат расейскае войска спыніло, і цяпераха бітвы на ўсім Галічанскім фронце развіваюцца як трэба, так што 7 лістапада Штаб апавешчае, што наступаньне аўстрыякоў у Галіччыне зусім спыніло расейскае войска. Канечна, заўзятые і крывавые бітвы тутака не спыняліся і не спыняюцца, пры чым расейцы узялі у палон шмат аўстрыяцкіх афіцэроў і салдат. З акружэнаго расейскім войскам Перамышлю аўстрыякі колькі раз мецiліся прарваць акружаючую лінію расейцоў, але за ўсякім разам былі адбіты і атступілі за свае крэпасные украпленьня.

**На Каўказкім фронце** у другой палавіне лістапада туркі, атрымаўшы значную падмогу, перайшлі ў даліне Ефрату і Ванскім раёне ў наступленьне, што выклікало у гэтых мейсцох цэлы рад невялікіх бітваў, у якіх брало верх расейскае войска, застаўляўшае атступаць атрады праціўніка. Далей паведамляе Штаб Каўказкай арміі, што турэцкае войска узмацовываецца у Ванскім вілаеці, на граніцы с Пэрсіей. На гэтым Ванскім напрамку 7 сьнежня ішлі бітвы, у якіх расейцы перамаглі туркоў і прычынілі ім вялікіе страты забітымі і раненымі. 9 сьнежня ў Ванскім напрамку наступленьне туркоў закончылася пераходам іх у абарону, пасьля заўзятаго супраціўленьня праціўніка, якое расейцы скрышылі, ўзяўшы палонных, аружжэ і набоі. У гэты-ж дзень, 9 сьнежня,

прыкмечэна усілены рух туркоў у Ольцінскім напрамку. У сарака-мышскім напрамку туркі пускаліся некалькі раз у неудачные атакі.

**На Заходнім фронце** агулам і хаўрусьнікоў і немцоў «палажэньне без вялікіх перамен». Абодва праціўнікі, як-то кажуць, таўкуць ваду на адным мейсцы, марнуючы дарма час і людзей, а карысьці з гэтаго ні на грош... Хаўрусьнікі толькі пасунуліся крыху на перад на сваім фронце у Бэльгіі і Фландрыі.

**Сэрбска-Аўстрыяцкая вайна** зьмянілася на такі лад, што сэрбы змусілі Айстрыяцкае войска выйсьці с Сэрбскай зямлі. Цяперака аўстрыякам прыходзіцца думаць аб тым, каб недапусьціць сэрбоў на сваю зямлю, у Вэнгрыю.

**На моры.** У ночы на 1 сьнежнь адным з расейскіх параходаў затоплен на Чорным моры нямецкі параход «Дэрынцье». Калі перад затапленьнем расейцы загадалі пакінуць параход усей камандзе, то толькі выйшлі два турэцкіе афіцеры і 12 салдатоў. Пасьля гэтаго расейцы ўзарвалі параход. Другі расейскі параход на Сярод-земным моры захапіў у палон нямецкі параход «Хайфа» і затапіў 2 турэцкіе параходы.—У Дарданэлях англіцкая падводная лодка затапіла мінамі турэцкі карабль «Месудіе». — Надовічы англіцка-францускі флот абстрэліваў украпленьня Дарданелаў.—Каля Ірландзіі наскачыў на міну і затануў англіцкі параход «Трытонія».—4 сьнежня немцы абстрэлівалі з мора гарады англіцкаго пабярэжжа: Гартльпуль, Гітбі і Скарборо. Пры абстрэлі Гартпуля забіто 82, ранено 250 жыхароў, маракоў забіта 15 і ранена 15.

**Не ваюючые дзержавы** нічым важным не выказалі сябе за гэты тыдзень. Адно адбыўся з'езд трох каралёў Скандынаўскіх зямель—Даніі, Швэціі і Норвэгіі. На з'ездзе каралі разважалі, як гэтым тром дзержавам злучыцца у хаўрус дзеле абароны сваіх супольных інтэрэсоў, звязаных с цяперашняй вайной.

## На вайне і каля вайны.

**Колькі грошы ідзе на вайну.** У прошлым нумэры мы далі лічбы страт на гэта павэдлуг часопісі «Financiel Times» *). У другім мейсцы, францускі вучоны Болье вылічыў, што ваюючым дзержавам вайна абходзіцца 5 мільярдоў марак у месяц (марка—каля 50 кап.). Цяперака быўшы францускі міністар Гюйо дае такіе лічбы расходаў на вайну: Вайна у першые шесьць месяцоў усім ваюючым дзержавам абыйдзецца: 1) расходы — 16 мільярдоў 200 мільёноў руб.; 2) страты на рабочых руках 16 мільярдоў 880 мільёноў руб., і 3) цэна грашыма загубленых людзей 9 мільярдоў 970 мільёнаў р., усяго—43 мільярды 50 мільёноў руб., або агулам каля 7 с палавінай мільярдоў руб. у месяц.

**Нямецкіе сілы.** Нямецкі урад афіціальна абвесьціў аб тым, колькі усяго войска выстаўлена на абадвух фронтах — Расейскім і Францускім — ня лічучы ратнікоў апалчэньня. Усяго выставілі немцы войска 100 корпусоў, з якіх 60 ваюе у Франціі і Бэльгіі, а 40 проці расейцоў. Корпус — каля 50,000 людзей. На гэту лічбу (каля 5 мільёноў) нямецкай арміі згаджаюцца і швэйцарскіе ваенные знатакі.

**Страты Бэльгіі** за 82 дні вайны—як падлічыў адзін бэльгійскі адвакат - выносюць агулам 2 мільярды рублёў.

**Абшары Франціі, занятые немцамі.** Фронт распалажэньня хаўрусных войск на францускай зямлі паміж рэкой Лісса і Вогезамі цягнецца каля 400 вёрст. Абшар Франціі, заняты немцамі, маець у сабе каля 20,000 квадратных (у доўжкі і ў шыркі) вёрст, або агулам адна дваццаць шостая часьць усей Франціі.

**Ваенные сілы Амэрыкі.** Паміж Японіей і Злучэнымі Штатамі Амэрыкі апошнімі часамі штось не ладзюцца прыхільные адносіны. З гэтай прычыны ня лішнім будзе зьвярнуць увагу на ваенную моц Амэрыкі: Злучэные Штаты маюць цяперака усяго 56,000 салдатоў, гатовых у кожную мінуту вырушыць на поле бітвы. Рэшту войска складаецца з міліціі (грамадзянская страж), і таей толькі частка прыгатавана як належыць да ваенных змаганьнёў. На Філіпінах, на выспах Гавайскіх, на Алясцы і ў Панамскім канале амэрыканскіе ваенные гарнізоны не вялічкі, так што для абароны гэтых мейсц іх за мала. Міліціі не хапае коней, прыпасоў, узбраеньня, самаходаў. Абарона берагоў зусім слабая; прызначэная для гэтаго артылерыя вельмі устарэла і не хапае ёй набоеў. Знатакі той думкі, што амэрыканская армія павінна мець ня меньш, як 500 тысяч людзей. Аднак трэба тут дабавіць, што сказанае выжэй адносіцца толькі да сухапутнай арміі, каторая папраўдзе не зусія важная. Але апрача гэтаго, Амерыка маець вялікі лічбай і сільны будовай ваенны флот. У разе вайны паміж Амэрыкай і Японіей, то гэта вайна перш за ўсё разыгралася б на моры, і растрыгаючай сілай будзе марская сіла Амэрыкі, а не яе сухапутная армія.

**Новые ваенные знiстожнікі.** Павэдлуг вестак з Бэрліна, аўстрыякі, у часе апошней сваей пабеднай атакі проці сэрбскіх пазыцій пад Белградам, першы раз пусьцілі ў дзела незнаные дагэтуль ваенные машыны. Зробленые на манер старадаўных рымскіх катапультаў, машыны гэтые выкідаюць вялізарные бочкі, напоўненые каменьнямі і ўзрыўнымі матэр'ямі,—каменьне распырсківаецца на дробные кусочкі і засыпае не малы абшар абстрэліванаго мейсца. «Работа» выстрэлоў страшэнная. Адно толькі, што набоі з гэтых знiстожнікоў людзей вельмі далёка не лятуць. Але с прычыны, што машыны гэтые былі прызначэны для абстрэліваньня аднаго берэгу Дунаю, з другога берэгу, то зрабілі яны спусташэньне дужэ вялікае.

*) Гл. № 48—«Аб усім па троху». Папраўка: У самым канцы весткі „Колькі абходзіцца Эўропе вайна" надрукована: «З палавінай мільёноў руб.» — Трэба читаць: „З с палавіной мільярдоў руб".

## Разсеяуся туман...

Разсеяўся туман. Вы бачыце?—тож зьвер!..
Бо, што было даўней, таксама ёсьць цяпер,
Бо, змеем с сваей скуры выпаўз новы век...
Вось—разгаданы сфінкс... Вось—божы чэлавек...

Ўжо досіць шкадаваць дзяціны, дзіўны сон,
Што песьні вам сьпеваў аб вас саміх шмат дзён!
Не пазірайце ў высь, бо дзеці вы зямлі!
Вы-ж сходаў да сьвятых дагэтуль не знайшлі!..
Дось сэрца вам спытаці.—Хай яно крывёй
Затонець... Яму дар — сьмяротны супакой...

Хай вечная душа, што ёсьць і што была,
Ідзець ад вас туды, аткуль сабе прыйшла!..
Бо вокліч вашых мук ня дойдзе да нябёс—
Агонь усё спаліў... Глынуло морэ сьлёз...

Вільня. 7/XII—14 г.

**Ясакар.**

* * *

Арлы—брацьця, дайця скрыдлы,
Бо у нізе жыць мне збрыдла;
Кіньця кожны адно пёрка,
Бо жыць ў нізе стала горка.
Хачу, арлы, ляцець з вамі
Над гарамі, над мурамі,
Крыльлем хмары разсекаці,
Сьмела ў неба заглядаці;
Жыць ў аблоках над зямлёю,
Скрыдлы раніць ў страшным бою,
Кроў с-пад сэрца людзей піці
І ў гару к сабе ўзнасіці.
Арлы—брацьця дайця скрыдлы,
Бо між людзі жыць мне збрыдла,
Кіньця кожны адно пёрка,
Бо у нізе жыць мне горка!

**Мацей Крапіўка.**

## С пад праху векоу.

У нашай беларускай мове, як можэ нідзе ні ў якой іншай, багата слоў такіх, каторые па тысячу і болей гадоў пратрывалі і дажылі да нашых часоў. Толькі-ж словы гэты хоць дажылі, але праз доўгіе сталецьця сталіся незразумелымі нам: слова асталося, але тые, каторые гаварылі і разумелі, сышлі пад зямельку, і слова сталося для нас нямым. Каб уразумець змест слова, трэба многа з усіх канцоў Беларусі сабраць аб ім вестак. Не адно с такіх слоў прыкрывае сабой цэлы сьвет праціканых паняцьцёў. Ажывіць гэтые словы і зразумець іх значэньня ешчэ можна, абы толькі кожны з вас патрудзіўся дзеля добрай справы, і ўсё, што зможэ даве-

# ЧАРАЎНІК.

*(Ахвяруецца Власту).*

— На пяколку ў роднай хаці цяпер куды выгадней было-б:—казаў свайму суседу стары Баханчук, злазючы с санак і з болем выціскаючы пальцамі правай рукі ледзяные сасулькі з вусоў,—старые костачкі мае ўжо досіць вымерзалі да гэтуль:

— Ое—ей! жыцьцё ты жыцьцё!—застагнаў яму у ватказ сусед Тодар,—аддухі захацеў чэлавек! Не-е-е, братка, ня трэба дармо псаваць хлеба на зямлі.

І суседзі пакурывалі люлькі. Па гасьцінцу у доўжкі цягнуўся цэлы абоз фурманак, штук с пятнаццаць. Усё—і коні, і людзі, і санкі—«кары», што былі прыгатоўлены для возкі калод з лесу да рэкі, былі пакрыты белым налётам мягкаго пухкаго сьнегу. Увакруг усё, як зачараванае, лежала пад белай коўдрай: і даліны, і ўзгоркі, і лес; якбы нейкая белая казка, што вецер разнёс па ўсіх ваколіцах! Усё, якбы сумысьля, прыціхла дзеле таго, каб прыслухівацца да лёгкаго шораху сьнегу, што нясецца на залядзянелых палёх, да гуду глухой мяцеліцы, што часамі, якбы умарыўшыся, прыціхала, а пасьля, ізноў, яшчэ з большым імпэтам пачынала сваю нудную, манатонную музыку. Дарога была завеяна, і вясковые, касматые, худые конікі памалу выцягвалі ногі са сьнегу, сумна павесіўшы галовы у ніз. Ціха ішоў кожны гаспадар за сваімі «карамі», каторые былі напакаваны пухцерамі сена і мяшкамі аўса. У некаторых на санях нешта сядзела, жывое, абхутанае у дзюравые кажухі і ў суконные сьвіткі. Гэта былі памочнікі—хлапчукі, каторых бацькі узялі с сабою на падмогу.

Ехалі селяне на заработкі на колькі месяцоў. Іх наняў лясны купец і ехаць прыйшлося ім колькі дзён да таго лесу, а надта ганяць конікаў сваіх, яны шкадавалі, бо ведалі што, ім, жывёлам гаротным, яшчэ хоціць нацягацца цяжкіх калод праз усю зіму... Вазакі паміж сабою гутарылі мала, толькі часамі, калі хто выкрасаў агонь, то другіе падыйходзілі задыміць люльку, дый паткпівалі ў тымжэ часе с чыйго небудзь каня, напрыклад: «твой, Тодарка, Лысы рысак, якбы кульгае крыху», альбо: «глядзі, акрутня зараз перарвецца». І гэткім парадкам кожын вертаецца зноў да сваей «кары».

Стаяла увесь дзень сівая імгла. Часам сьнег сыпаўся, чысьценкі, дробненкі, як с-пад рэшэта мука у добрай гаспадыні, і не відаць было дзе канчаецца лес ці поле і дзе пачынаецца небо.

Часамі на момэнт сьнег перэставаў сыпаць з верху, тады усё—і абшар палёў, і лес, і небо і фурманкі вызначаліся кожнае асобна, белае на белым, нібы фігуры на мармуры. Усюды лежала таёмная павага зімовай цішы... І конікі і людзі цёплым дыханьнем сваім вытваралі цэлые хмары белай пары і краталіся усё далей і далей... Гледзючы з далёку, здавалося, што яны адвечна гэтак кратаюцца, не памятаючы пачатку дарогі і неспадзеваючыся канца...

Болей усіх якбы кратаўся стары Баханчук. Нешта ў яго было ня ўсё так, як трэба; то хадзіць за фурманкай было трудна, то лысы яго атсупоніцца, то нейкіе думкі невясёлые апануюць яго, то ў грудзях патпірало і у вачах муцілося. — На агул, сягоньня было яму нешта не па сабе. Ён сеў на сані, укапаўся ў сена і думаў хвілінку задрэмаць. Ён прыплюшчыў вочы гледзючы на дугу, што якбы ў самае неба ўехала, але хутка мяцеліца пачала дзьмухаць яму у самые вочы. Ён масьціўся, масьціўся, каб сесьці як кольвечы плечамі к ветру, але вецер як сумысьля круціў са ўсіх бакоў, пакуль Баханчук усёж-такі ухітрыўся прытуліцца тварам да сена, раней атросшы с таго мейсца сьнег. Нарэшці, ён троха сагрэўся і задрэмаў. У сьне нешта зрабілося яму цяжка, якбы хто душыў яго. Доўга мармытаў ён сабе нешто пад нос, хацеў прачыхнуцца, ды ня мог. Здаецца, каб хто яго пабудзіў цяпер, дык той-бы яму вялікую ласку зрабіў; але вось коні павярнулі на пагорак, і ад штурханьня ў вадной ухабіне, ён адразу прачхнуўся і давай азірацца. Хацеў падняцца і прайсьціся, але слабасьць абхапіла яго, галава кружылася, і ён аткінуўся назад на санёх. Прабаваў другі раз падняцца сам, зьдзівіўшыся такой сваей слабасьці, але нічога ня выйшло, толькі яшчэ болей пачуў ён сваю бязсільнасьць: у грудзёх калола, галава гарэла.

— Матка Боская!.. нейкая немач напала... Тодар, а Тодар! — глухім голасам загаманіў Боханчук да свайго суседа.

— А што?—адазваўся Тодар.

— Нешта ня дужыцца мне, галава як шротам напоўнена, ўнутры млосна, а слабасьць гэткая прабірае, што ратуначку німа!

— Перамёрз, відаць, — сказаў Тодар, — альба жонка перад выездам салам перэкарміла.

— Ня ведаю. Каб Богу не саграшыць, я не шкадуючы пад'еў... Але і мароз, хоць ты лысых лічы!

— Кепска! — казаў Тодар.

— Кепска! — казаў Баханчук, — мо Бог зьмілуецца, во і Млынцы недалёка, там хіба заначуем.

даецца аб гэты ад старых людзей, пастараўся запісаць.

Словы, каторых значэньня я дашуківаюся, такіе: багач, варапай, волат, Кашчэй, Найскі Вялікдзень, Стаўры, Ярэц.

**Багач.** Слова «багач» дужа старое, азначае агонь, гарачые вугалі.

— Ці ужываюць у вас гэтаго слова? У якім значэньні? Ці не расказываецца у казках, або ці не пяецца у песьнях, аб багачу, як аб жывой асобе?

**Варапай.** Гэтае слова сустрэкаецца у вясельных песьнях, пяецца: «Ах ты караваю—варапаю!». На Падзьвіньні расказываюць людзі, што Варапай—гэта такое стварэньня, на хрыбце катораго трымаецца земля. Падобен ён да варопоўкі (жабы, рапухі), але з заросшыма вачыма.

— Ці ёсць каля вас падобная легенда? Што разумеюць пад словам «Варапай»? Чаму каравай называюць Варапаем? На чым—калі расказываюць у вас—трымаецца земля.

**Волат.** Валатоўкамі многа дзе на беларусі называюць курганные магілы (магілы волотоў). Расказываюць людзі, што жыло калісь на сьвеці племя дужа вялікіх людзей, так вялікіх, што цяперэшні чэлавек перад волатам выглядаў, як мурашка перад цяперэшнім чэлавекам. Пачалі малець людзі ад таго, што сталі есьці варэнае. Адзін раз дзеўка волотоў ішла полем і убачыла звычайнаго чэлавека, што араў валамі, яна узяла таго чэлавека разам с плугам і валамі на далонь, прынесла да свайго бацькі і кажэ: — Ці бачыў, ты тата, якая сьмешная мурашка у мяне на руцэ? А бацька ей кажэ:—Не, дзеўка, гэта не мурашка, а такі-ж чэлавек, як і мы, толькі маленькі. Калісь усе людзі будуць такіе, а перад канцом сьвета ешчэ болей паменшаюць: будуць у семярых аднаго пеўня рэзаць.

— Ці называюць у вас курганы «валатоўкамі», а калі не, то як? Ці ёсьць якіе расказы і казкі аб волатах, аб касьцях іхніх, ды інш.

**Кашчэй.** Слова гэтае вядомае у старой пісьменнасьці (ад XII в.) азначало калісь — раб, нявольнік; цяпер сустрэчаецца у казках.

— Што разумеюць у вас пад гэтым словам?

**Наўскі Вялікдзень.** «Навій» па славянску значэ—нябошчык. «Наўскім», «нашскім», «наскім» Вялікаднем называюць вясенные памінкі па дзядох,—у адным мейсцы Радаўніцу, у другім Сёмуху.

— Ці спраўляюць у вас вясной памінкі і як іх называюць? Калі «Наўскі Вялікдзень»—на Радаўніцу, ці на Сёмуху?

**Стаўры.** Каля Дзьвіны і Бярэзіны у першай палавіне XIX ст. сьвяткавалі перад Сёмухай Стаўроўскіе дзяды. У часе вячэры на гэтых дзядох, гаспадар узяўшы у руку місу с куцьцёй кланяўся на покуць і тры разы казаў: «Стаўры, Гаўры, гам, прыходзьця к нам».

Ёсьць казка, у каторай расказываецца, што былі у аднаго князя два сабакі—Стаўры і Гаўры, каторых ён любіў дужа, а калі яны адзін па адным акалелі, то князь той загадаў спраўляць па іх штогоду памінкі. Казка гэта, як з ўсяго відаць, злoжэна у пазьнейшые часы хрысціянскім духавенствам, каторае змагалося с перажыткамі даўнай паганскай веры. Гэтак, паганскіе багі, пад ўплывам хрысціянскаго духавенства перэтварыліся у „бесоў“, а дзяды-пагане—у «псоў».

Слова «Стаўры» прыкрывае сабой багаты зьмест. Дзеля большаго высьненьня, кудой ісьці у шуканьні, дадам, што у стародаўные, паганскіе часы былі вядомы у нас імёны людзей: «Ставер», «Стаўро», «Ставр», гэтае апошняе імя меў адзін з ноўгародзкіх сотнікоў каля 1118 г.

Адзін селянін с-пад Дзісны тлумачыў мне, што «Стаўры»—гэта былі такіе людзі—да паяса чэлавек, а ад паяса конь».

— Ці сьвяткуюцца у вас Стаўроўскіе (кажуць ешчэ Старарускіе) дзяды і калі? Ці ёсьць якіе расказы звязаные з гэтым іменем?

**Ярэц.** Старое названьне месяца мая.

— Ці называюць цяпер гэтак гэты месяц? Што разумеюць пад гэтым словам?

**Увага.** Запісываючы атказы трэба найбольшую звертаць увагу на міфологічную старану аткааў. Атказы прашу прысылаць на такі адрэс: Вільня, Завальная № 7, «Беларуская кнігарня» Для В. Л.

**В. Л.**

---

# З Беларусі і Літвы.

## З Віленшчыны.

**«Дзень штукарства».** У панядзелак 8 лістапада у Вільні адбыўся «Дзень штукарства» на карысьць раненых ваякоў і пацярпеўшых ад вайны жыхароў віленскай губэрні. На вуліцах прадаваліся маркі і «аднаднёўка», надрукованая у пяці мовах: расейскай, беларускай, літоўскай, польскай і жыдоўскай. У гэтых-жэ пяці мовах друкованые—былі расклеены па гароду абвесткі аб «дню штукарства». «Дзень» гэты быў наладжэны віленскім таварыствам прыгожаго штукарства. «Аднаднёўку» можна яшчэ і цяпер выпісываць і купляць у «Беларускай кнігарні», (Вільня, Завальная 7); каштуе 10 кап. без перасылкі.

**Аб гімназіях.** Папечыцель віленскаго навуковаго округу выдаў цыркуляр да вучыцелёў у якім звертае увагу на тое, што навучаньне ў срэдніх школах вядзецца схолястычна (суха, драбнічна). Вучыцелі зусім не карыстаюць з здабыткаў аб добрым навучаньні. У пачатковых школах навука ідзе болей навучным способам. Папечыцель просіць вучыцелеў пастарацца аб палепшэньні справы навучаньня.

**Палонные.** Надовічы з віленскай перасыльнай турмы перавялі на чыгунку, для высылкі на поўнач, некалькісот згнаннікоў з Усходней Прусіі. Большая частка з высыланых—кабеты і дзеці. Паміж мужчынамі шмат старцоў.

### Пісьмо с Смургоні.

*(Ад нашаго карэспандэнта).*

**Перамена.** Прайшло тры месяцы з лішнім забароны п'янства і наш люд троха-па-троху пачаў забывацца навукі аб гарэлцэ. І толькі наглуха пазамыканые шынкі ды пазапечатаваные склады і манапольки смутна прыпамінаюць мінуўшчыну...

Шынкары ходзюць нудные, маркотные, як тые мухі у час восеньней непагоды, чуюць канец свайго ляніваго жыцьця. І змяніліся яны на гэты час—куды! праз колькі гадоў ніхто гэтак не змяніўсябы... Каторы быў пузаты—у таго няглeдзючы бруха мнейшае — мінулася кату масьленіца! Каторы быў сівы — зусім пасівеў. А хто быў ад прыроды худы — сохнець у шчэпку.

Затое настаець жыцьцё іхнім «кліентам». Бывала, дзе часьцей спаткаеш Яську Чорненькага — дзе-ж, калі не ля шынка?! А цяпер, глядзі, ён носіць добрае адзеньне, а кожную суботу зносіць жонцы увесь заработак. Дзеці ня церпяць голаду, а жонка ня бегае ў хвасьце Яські, калі той атрымае пэнсію. Яська сам цяпер рупіцца аб сям'і і прыносіць ей то кусок мяса, то кавалак белаго хлеба.

Яська мае надзею жыць.

Але не трацюць надзеі і шынкары. Заўсёды можна відзець у месьце іх гурток. Усё гешэфтуюць... Усё рахуюць, колькі яны будуць мець страты ад забароны гарэлкі, ад прадажы аднаго толькі піва ды віна. Лічуць, спрэючацца, але усё ткі не трацюць надзеі... Хоць півам, хоць віном, але ткі будуць таргаваць!

**Вытахлася.** Надойчы звозілі па загаду акцыза водку з манапольки. Як пачалі выносіць...

— Божа-ж мой! Колькі нездабытаго «дабра». Колькі бутэляк, поўбутэляк, гарцоў, сотак!.. Ажно вочы разьбегаюцца і язык сьліну гоне!.. Зносюць, і складаюць у вазы. Рукі дрыжаць... Галава круціцца...

З непрывычкі, нейначэ.

Вылажуць радок—здаецца поўны. А прынясуць яшчэ—у першым не хапае... Галава з ліку збіваецца.

Толькі стражнікі тарэшчуць вочы, чаго, здаецца, не трэснуць... Але і іх вочы не шкляные,—з вялікай натугі зрок слабее—і к вечэру пачалі плюшчыцца...

Звязлі гарэлку да Маладэчны, аблічылі — не хапае ткі насапраўды!

Вот табе маліна! На некольки дзесяткаў рублёў гарэлкі вытахлася!.. Думалі, разбіліся бутэлькі — выцякла... ажно у возе суха! Зараз акцызнікі давай нюхаць паветра—цяпер з далёку чуваць, дзе гарэлкай нясе — думалі знайсьці мейсцэ, дзе разлілася гарэлка. — Ані! І паветра вытахлася!.. А у гэтым я вінавачу стражнікаў; бо як жэ: і іх насы паветрам дышаць. Дык як стаялі яны водле самых вазоў — вот ужо некольки носоў і болей!

**Ці зьвялася водка.** Тым часам ня можна сказаць, што гарэлка у нас зусім вывялася. Не. Усё пачуешь—там нясе палітуркай, а гэнам—простай сівухай, а адтуль —

---

— Высьпішся ў цяпле і як рукой адбярэць!

Тодар паведаміў другіх вазакоў. Падыйшлі да Бахунчука яшчэ некаторые, і ўсе, у адзін голас, казалі, што гэта глупства, а калі што якое, дык ад Бога неўцячеш! І паехалі.

Баханчуку не палягчэла.

На полі пачало цямнець. Паказаўся спачатку агоньчык, нібы зорка, а за ім цэлы рой аганькоў, што клікалі с прыхільнасьцяй да сябе ў хату, да цёплаго прыпечка, да стала—на гарачую вячэру... Хутка запахло дымам і вёскай. Забрэхалі сабакі. Людзі ўехалі ў вёску і астанавіліся у карчмара Юдэля. Управілі усе фурманкі у вялікую стадолу, выпрэглі коні, распарадкавалі, далі корму і, ўзяўшы кожны свой клумак, увайшлі ў хату. Баханчук сам ўвайсьці ня мог, дык яго прыйшлося падрукі унясьці. Перш-наперш далі яму выпіць чарку гарэлкі, ад чаго ўсё-ж такі Баханчуку не палягчэла.

Людзі павячэралі, напаілі коні, далі ім аўса і ляглі спаць. Лёг і Баханчук. На заўтрае, раніцай, падняліся яны зноў у дарогу, а Баханчук ні з мейсца.

— Браточкі родненькіе, не паеду!—загаварыў ён, — чую, што сьмертухна мая падыйходзіць.

Думалі-думалі людзі, што тут рабіць і дадумаліся пакінуць яго тут, у вёсцы, у аднэй беднай адзінокай кабеціны, Зосі, жыўшай на самым канцы вёскі. Зося згадзілася даглядаць Баханчука, але толькі з гэткай умовай: калі ён выздаравеіць, то заплаціць ёй колькі рублёў, а калі памрэць, то яна па людзку хаўтуры ўладзіць, а за працу сабе забярэць яго кажух. Каня і «кары» забраў с сабою яго сваяк.

Астаўся Баханчук у Зосі. Яна шчыра яго паіла зёлкамі рознымі, але гэта нічога не памагала — стары усё слабеў ды слабеў, сумна пазіраючы прыгаснутымі вачыма на цёмные куткі убогай хаткі, абсыпанай вялікай гурбай сьнегу. Цяжка было гаротніку на душы, што прышлося уміраць яму сярод чужых людзей. Цэлы тыдзень пралежаў так на валаску ад сьмерці, а на сёмы дзень пад вечэр аддаў Богу душу.

На хаўтуры, болей як пры жыцьці, пачалі зьбірацца людзі, бо хаўтуры Зося уладзіла не шкадуючы. Чэлавек пакінуў некольки рублёў грошы і свае вопраткі, а яна была баба сумленная і шмат карыстаць не хацела. Пры нябошчыку на зэдліку гарэлі дзьве сьвечкі, а побач на стале ладзіліся памінкі. Янка сталяр гэбляваў на тапчане сасновую дамавіну, а людзі сядзелі за сталом з набожнай мінай, пеялі песьні запівалі гарэлкай і закусывалі тым-сім, ізноў пеялі, выпівалі і закусывалі. Што-ж, у гэтым часе работа ў хаце не гарыць, а пры сьвятой справе яны прыхільна і шчыра спаўнялі свой чэлавечы абавязак. Зося сядзела на пяколку, патпіраючы худую бараду сваю косьцлявым кулаком, і тужыла-бедавала, над чэлавеччым жыцьцём, над немінучым людзкім горэм.

Доўга думала яна аб гэтым пад шэпярлівы гуд галасоў селян ды пад сумна-працяжную хаўтурную песьню... Сьвечкі напоўнілі хатку бледным, дрыжачым паўсьвятлом. На закурэных сьценах цені людзей якбы распаўзаліся ад цеплаты, і ўсё гэта так вабіло да сну, што Зося, неспаўшы цэлы тыдзень, зажмурыла вочы і задрэмала, ўсё-ж такі неперэстаючы час ад часу пазіраць на жоўты твар нябошчыка. Але тут... о Божухна! ці гэта яна спала, ці не спала: здалося ей, што нябошчык расплюснуў вочы ды глянуў на яе... Дрыжака прабрала яе з галавы да ног... Спаць ўжо ёй болей адхацелася... Ціха перэжэгналася і давай зноў глядзець на нябошчыка, і што гэта?! Ці-ж можэ быць! Нябошчык крануў рукой... У беднай кабеціны валасы дыбам сталі на галаве, сэрцэ гэтак закалацілася, што дыханьне сьпёрлася і нехаця выврваўся з яе грудзей стогн...

— Што гэта? Зося, што ты тамака?—ўсхапіліся некаторые з-за стала. Чуць жывая Зося злезла с пяколку і шопатам расказала селянам ўсё, што яна бачыла.

— Эт, глупства казалі яны, — гэта табе здавалася; ўжо да канца сьвета не кране ён ні рукой, ні нагой... Пасьмяяліся з яе і ўзяліся ізноў за сваё. Бабе ўгаварылі, што гэта ёй толькі здавалося, і яна вярнулася на пяколак грэцца, не пакідаючы час ад часу пазіраць з апаскай у старану нябошчыка. Некаторые, з болей палохлівых, каля стала таксама вукрадкам пачалі пазіраць на яго.

Не прайшло і дзесяці мінут і ўся хата якбы здрыганулася ад крыку. Некольки людзей з імпэтам крыкнула: «А ей!» Некаторые астаўбянелі, некаторые крычалі: «Ён ад'жыў! ад'жыў!» Ўсе бачылі, як нябошчык расплюснуў і заплюснуў вочы і крануў рукой. Здавацца ўсім ўжо не магло...

— Матка Боская! ён—чараўнік! чараўнік!—як зарэзаны крыкнуў з вялікім страхам самы старшы Грыгор, а Янка сталяр тым-часам з імпэтам ухапіўся за тапор, які тарчэў у сьцяне.

**Змітрок Бядуля.**

*(Канец будзе).*

наліўкамі, настойкамі, каторые і ня ведама аткуль яшчэ бяруцца.

Сэнс у тым, што забарона п'янства сталася не ўпаўне. Есь яшчэ способы напівацца. Пры тым я перэдаю здарэнэне, як пры вывозе гарэлкі разакралі яе на нескольկі дзесяткаў рублёў.

*Смургонец.*

## З Міншчыны.

**Школа садоўніцтва.** Пры мястэчку Каролін, мазырск. пав., гаспадар І. Ансэльм падараваў земству 2 дзесяціны зямлі на устройства школы садоўніцтва і агародніцтва.

**Запамога газэце.** Мазырскае земство атпусьціло 1125 руб. на запамогу газэце «Мозырянинъ», абавязаўшы рэдакцію разсылаць дарма тэлеграмкі Петраградзкаго агенства па вёсках і сёлах павету.

**Падаткі.** Пінская гарадзкая дума пастанавіла да канца вайны ня зысківаць гарадзкіх падаткоў з жонак пакліканых на вайну запасных і ратнікоў.

**На бальніцы.** Мінскае земство атпусьціло 20,000 руб. на будоўлю у Мінску бальніцы імені Столыпіна і 39,000 руб. на утрыманьне 35 ложэк для раненых у лазарэці Гасударыні Марыі Фёдароўны.

**Доктарка.** На становішчэ земскаго доктара ў докшыцкі участак, барысоўск. пав., зацьверджэна доктарка Х. Іцковічыха.

**На дарожную павіннасьць.** Пінскае земскае сабраньне, дзякуючы бездарожжу, пастанавіло аблажыць усе гаспадаркі ў павеці асаблівым падаткам на дарожную павіннасьць.

**Калядны кірмаш** на дзерэва будзе ўладжэны у Мінску, як і тые гады, ад 25 сьнежня да 2 студня 1915 г.

**Тэлефон.** Пінскае земскае сабраньне пастанавіло наладзіць у павеці тэлефон. На расходы для састаўленьня праекту як і кудой правясьці тэлефон атпушчэна 600 руб.

**Такжэ ня вытрывалі.** За прыкладам бабруйскіх, так сама «бацькі» радные гор. Новагрудка «не знайшлі перашкод» для аткрыцьця у Навагрудку ў 1915 г. 3 піўных і 4 таргоўляў с прадажай віна і «моцных напіткоў».

**Самагубство.** У засьценку Беляўшчына, пінск. пав., атруцілася карболькай селянка П. Турко 29 гадоў.

**Вылечыўся!** У лельчыцкай земскай бальніцы селянін Н. Шуканоў дадзеные яму парашкі на некалькі дзён зьеў усе адразу, думаючы, што такім чынам адразу і вылечыцца. Але вышла наадварот—адразу памёр.

**Шалёны воўк.** Надовічы у ночы у вёску Токеж, мазырск. пав., урваўся шалёны воўк і напаў на сабак. Бараніць сабак выскачылі на вуліцу селяне. Воўк прыняўся за селян і 5 з іх пакусаў. Адзін с пакусаных разсек тапаром ваўку галаву. Пакусаных селян і галаву ваўка завязлі у Мінск у бальніцу, дзе лечуць ад шаленства.

**Пажары.** У дварэ Зарэччэ, барысоўск. пав., згарэў бровар памешчыка Сьвіды. Шкоды—50,000 руб. Патпаліў якобы мейсцовы селянін Смолік, які гэткім чынам задумаў... змагацца с п'янствам. — Надовічы у вёсцы Марочнае, пінскаго пав., ад неасьцярожнасьці з агнём селяніна Н. Харужаго згарэла 20 селянскіх будоўляў належачых да С. Усвіча, М. Гуца, Д. Юхновіча і інш. Шкоды—8,000 руб.

**800 судавых спраў.** Мінскі губэрнатар назначыў 800 угалоўных спраў па абвінавачэньні каталіцкаго духавенства мінск. губ. за незахаваньне прбвілоў аб веры.

---

## З усіх старон.

**За сумыснае калецтва** самаго сябе або пры помачы іншых асоб, з мэтай выкруціцца ад ваеннай службы ці ўчасьця ў ваенных змаганьнях, хоцьбы калецтва было зроблена толькі да часу, вінаватые караюцца: 1) у часе вайны у раёне ваенных змаганьнёў — пазбаўленьня ўсіх правоў і кары сьмерцяй обо ссылцэ ў катаржные работы ад 4 да 20 год, або бяз тэрміну; 2) на відавоку непрыяцеля—пазбаўленьня ўсіх правоў і кары сьмерцяй. Гэтак сама караецца і той, хто с такой самай мэтай пакалечыць другога або пашкодзіць яму здароўе, або у гэтым яму дапаможэ. Закон гэты ўвайшоў у сілу с 16 кастрычніка гэтаго году.

**Ваенна-полевы суд.** Прыгавор гэтаго суду ўступае ў законную сілу зараз-жэ пасьля абвешчэньня яго на судзе і без аткладу, ў кожным здареньні не пазьней сутак прыводзіцца ў выкананьне па загаду начальніка, зладзіўшаго суд.

**Аб над'зорных.** Міністэрство ўнутрэнніх спраў раз'ясьніло, што высланые па прыгавару сельскіх обчэстваў пад над'зор паліціі запасные салдаты і ратнікі павінны яўляцца на зборные пункты як і ўсе іншые прызыўные.

**Аб сем'ях запасных.** Сынод загадаў сьвяшчэнікам зьвярнуць добра увагу на тое, каб у прыходах (парафіях) усе сем'і пакліканых на вайну былі абзнаёмлены аб праве атрымліваньня імі казённай запамогі і каб гэта запамога выдавалася у сваім часе і ў законным разьмеры.

**Аб няшлюбных жонках** выясьнілося, што яны права на казённую запамогу (паёк) не маюць. і дзеля гэтаго патрэбна, каб хоць прыватные ахвяры іх не абміналі.

**На выдаваньне казённай запамогі** сем'ям пакліканых на вайну ўласьці зьвярнулі увагу. Рэч у тым, што некаторые сем'і, атрымліваючы запамогу на кожную душу, бяруць агулам болей грошы, як мог зарабляць іх пакліканы на вайну семянін. І вось з гэтай прычыны выйшоў прыказ да губэрнатароў, каб яны далі звесткі да 21 сьнежня г. г. аб сем'ях, атрымліваючых болей як 20 руб. месячнай запамогі ад казны.

**Праца ваеннапалонных.** На казённых работах працавало к 31 кастрычніку 1914 г. ваеннапалонных немцоў і вэнгроў 3430 людзей. Работа іх ідзе найболей каля устройства каналоў і рэчных шлюзоў у Ноўгарадзкай, Яраслаўскай, Аланецкай і інш. губ.

**Карты.** Забаронена іграць у карты у ваенных лазарэтах і на ўсіх жалезнадарожных станціях.

**Для калек** ёсьць у Петраградзе майстэрня, у якой дарма кожны скалечэны на вайне можэ атрымаць штучные рукі, ногі, вочы, зубы інш. Кожны скалечэны ваяка, калі захочэ з гэтай майстэрні скарыстаць, павінен перш аб гэтым з ёю спісацца, а едучы ў майстэрню, павінен мець с сабой дакумэнты, што папраўдзе с прычыны вайны ён скалечаны. Адрэс такі: Петроградъ, Б. Сампсоніевскій пр. д. 9—12, «Маріинскій пріютъ для ампутированныхъ увѣчныхъ воиновъ».

**Акцыз.** С 15 лістапада павялічаны акцыз з дрожджаў, запалак, папероснай паперы і гільзаў.

**Казна і паліцыя.** Сэнат разьясьніў, што калі паліцейскі чын зышчэ с каго колечы належные казьне грошы і гэтые грошы растраціць, то казна ўжо не мае права другі раз зысківаць іх з заплаціўшаго, а толькі з віноўніка растраты.

**Штрафы.** Маскоўскі градачальнік аштрафаваў па 3,000 руб. газэты «Утро Россіи» і «Русское Слово».

**Справу аб разгроме ў Петраградзе** нямецкаго пасольства Петраградзкі акружны суд пастанавіў спыніць.

**У Віндаве** ваенные ўласьці загадалі, каб ад 4 с паловай гадзіны усе вокны кватэраў і крамоў былі шчыльна завешаны так, каб ані не было відаць з надворку праменьняў сьветла.

**За гарэлку.** У Іркуцку адзін п'яніца забіў доктара Брянцэва за тое, што доктар не хацеў даць яму рэцэпту на выдачу з аптэкі спірту.

**За політурку—вочы.** У газэтах пішуць, што варшаўскіе бальніцы перапоўнены асьлепшымі ад піцьця політуркі. Большая часьць хворых ужо ніколі ня верне сваіх вачэй.

**Забарона процi політуркі.** Петраградзкі градачальнік, пад штрафам да 3000 руб. або 3 месяцы турмы, забараніў прадаваць політурку асобам, не маючым на гэта асабліваго пазваленьня.

**Пажар карасіны.** У Баку надовічы згарэла з невядомай прычыны некалькі карасіновых студняў. Пацярпела ад пажару колькі людзей.

**Гарэлка і пажары.** Як падлічыла Казанская земская управа, то пажароў па ўсей губэрні у жніўні праз пяць год (1909—1913) было ў срэднім — 82, а сёлета — так сама у жніўні, калі забаронена гарэлка, было ўсяго 20 пажароў. Як бачым—гарэлка ня толькі людзей паліла, але і іх будынкі.

**Гульня ў вайну.** У аднэй вёсцы адэскаго пав. сабраліся дзеці, дзевяці ды дзесяці гадоў, і пачалі гуляць у вайну. Падзяліліся на немцаў і расейцаў, наладзілі ўкрапленьня і пачалі атаку. І вось ў часе гэтай храбрай атакі на «нямецкіе пазыціі» адзін «расеец» так спрытна выцяў драцяным прутам у галаву «немца», што той на мейсцы і сканаў. Судзючы з гэтаго, то часы зьменяюцца. Калісь дзеці ігралі у вісельнікоў, цяпер—у ваякоў...

**У Польшчы.** Польскаму грамадзянскаму камітэту урад пазволіў наладзіць у Варшаві асаблівую грамадзянскую гоноровую стражу (міліцію), якая будзе спаўняць паліцейска-вартаўніцкую службу. —Павэдлуг урадовых звестак, да лістападу выехала з Варшавы каля 260 тысяч жыхароў. У першую палавіну лістапада прыбыло 75 тыс., а ў другую—125 тыс. Большая частка (75 прац.) вярнулося назад з Расеі, а рэшта —гэта уцекачы с тэатру ваенных змаганьнёў. Агулам лічба жыхароў Варшавы зьмемшылася на 80—100 тысяч людзей. — У Любліне с прычыны частаго атруцьця дэнатурованым спіртам, вінаватых ў прадажы гэтаго спірту ўласьці высылаюць у аддаленые мейсцы на ўвесь час вайны, незалежна ад трохмесячнаго арышту.—Рада міністроў пастанавіла пажычыць с казны 55 мільёноў руб. на першые гаспадарскіе патрэбы польскіх губэрняў, пацярпеўшых ад вайны.— У Лодзі харчэўные прадукты страшэнна падаражэлі; былі дні, калі плацілі па 1 руб. за фунт хлеба, 75 кап. за пуд дроў, 35 руб. за мяшок мукі.

**У Галіччыне.** У Львове, Самборы, Тарнопалі, Станіславове і Чэрнеўцах аткрываюцца двухмесячные курсы расейскай мовы для вучыцелеў і вучыцеляк усходняй Галіччыны і Букавіны. Прыйманьне прызначэна у першай палавіне студня. — Асобы, пасланые у Галіччыну пад кераўніцтвам дэпутата Гас. Думы сьвяшч. Мітроцкаго, прыйшлі да пераконаньня, што ў Галіччыне аб ніякай уніі і гутаркі быць ня можэ, бо тамтэйшы народ у акуратным значэньню гэтаго слова ёсьць народам праваслаўным. Толькі станы інтэлігентные (асьвечаные) лічуць сябе за уніятоў.—Уніяцкі сабор у Ярослаўі, які 300 год таму назад быў падобна праваслаўнай сьвятыняй, пераменена цяперака у сабор праваслаўны.—«Прыкарпатская Русь» пішэ, што Украінская Глаўная Рада пэранесла з Львова у Вену украінскую штодзенную газэту «Діло», дзе цяперака і выходзіць у сьвет раз на тыдзень.

**У Фінляндзіі.** Глаўны начальнік петраградзкаго ваеннаго округу абвесьціў 3 сьнежня абавязываючую пастанову, па якой, пад страхам атседкі ў турме да 3-х месяцоў, або штрафу да 3000 р., забараняецца перавозіць уселякую прыватную карэспандэнцію у Фінляндзію і за граніцу, а такжэ с Фінляндзіі і з за граніцы ў Петраград.

---

## Аб усім па троху.

**Немцы для сваіх салдат.** Нямецкіе газэты аткрылі падпіску на калядные падарункі для арміі. Кожнаму салдату маняцца паслаць пакунак с такімі рэчамі: пару нагавіц, пару цёплых панчох, ёмкую каўбасу, сухарчыкі, яблыкі, 12 цыгар, каля поўфунта цукру, кусок мыла, сьвечку для елкі, не вялікую бутэльку каньяку, 40 аткрытак і календар на 1915 год.

**Жыцьцё гарматы.** Звычайная палёвая гармата можэ даць толькі 4000 выстрэлаў, дзеля таго што па кожным выстрэле руля па троху псуецца—і далейшая ужываньне яе становіцца немажлівым. Дзеля таго, што адзін узрыў пораху і пераход кулі праз рулю трывае толькі 1/100 сэкунды, дык цэлае «жыцьцё» гарматы пры 4000 выстрэлах трывае толькі 40 сэк. Карацей яшчэ «жывуць» гарматы асадные і морскіе. Найбольшы лік іх выстрэлаў даходзіць ад 100 да 300,—залежна ад калібру т. е. сярэдзіны руля, і набояў,—так, што чым большы калібэр—тым меньш можэ зрабіць выстрэлоў. Лічучы час узрыву і пераход кулі так сама 1/100 сэк., гармата тая «жыве» толькі 1—3 сэк. Адзін выстрэл з гармат асадных і морскіх каштуе да 10,000 р. Выстрэлы с палевых гармат так сама дарагіе: залежна ад сыстэму кулі—граната, шрапнэль, куля, бомба — цэна аднаго выстрэлу каля 14—22 руб. Цікава дабавіць тут, што немцы у часе абстрэлу Арраса выпускалі ў мінуту 62 гранаты, т. е. 4,900 гранат у гадзіну.

**Нямецкіе гарматы.** У нямецкай арміі першае мейсца займаюць цяжкіе гарматы з люфай у 16 цаляў шырынёю. Гарматы гэтые важуць па 750 пудоў. Перавозюцца на асаблівых пляцформах, цягнутых паравіком. Гранаты (кулі) гэтых гарматаў напоўняюцца ўзрыўнымі саставамі і волавам. Кожная такая куля важыць 40 пудоў і каштуе 10,000 руб. Выстрэленая куля ляціць 7 вёрст. як разарвецца—даець 1,200 асколкоў. Асколкі адной такой бомбы разлетаюцца каля 45—60 аршын ва ўсе староны ад точкі ўзрыву. Адну с такіх нямецкіх гарматаў недаўна, пішуць газэты, на заходнім тэатры вайны разарвало. «Работа» была жудасная: усіх паслугачаў і каля 250 людзей, быўшых непадалёк, пашматало на дробные кускі, пры гэтым часьці чэлавечых цел упалі за 10½ вёрст ад мейсца ўзрыву; асколкі забілі і паранілі шмат салдатаў, якіе стаялі за 6 с палавінай вёрст ад гарматы; ззаду ад мейсца устаноўкі яе некалькі фэрм (сялібаў) саўсім разрушэна і яна сама пахавалася у агромнай яме, выкапанай узрывам.

---

Рэдактар-Выдавец
**І. Луцэвіч.**

Друкарня Марціна Кухты, Татарская 20.